# С К А Р Ы Н І Ч

Літаратурна-навуковы гадавік

Выпуск 10

Москва
2011

ББК 83.3.Бел.7
С42

**Укладальнікі:**
Аляксей Каўка
Віктар Чайчыц (каардынатар праекта)

Скарыніч: Літаратурна-навуковы гадавік
Вып. 10. – Москва : "ПКЦ "Альтекс" 2011. – 344 с. : ил.
ISBN 978-5-93121-293-7

Чытачу прапануюцца творы беларускай літаратурнай класікі, прысвячэнні М.Багдановічу, Ул.Караткевічу, малавядомыя старонкі спадчыны М.Лабойкі, І.Грыгаровіча, І.Насовіча, П.Шпілеўскага, В.Ластоўскага, Я.Хлябцэвіча, Б.Тарашкевіча, Ул.Дубоўкі, М.Улашчыка; скарыназнаўчыя матэрыялы, архіўныя сведчанні пра адраджэнне беларускай дзяржаўнасці, пра эміграцыю - БНР 1920-х. Доўжыцца тэма прысутнасці Беларусі, беларуса ў расійскай, маскоўскай прасторы, уключна з таемным лёсам Крыжа Лазара Богшы і Еўфрасінні Полацкай.

ISBN 978-5-93121-293-7

«ПКЦ «Альтекс», 2011

## Уладзімір Дубоўка

# Пра адзін маскоўскі дом

Жыву я ў Маскве з 1915 году. Праўда, даводзілася выязджаць на некаторы час: то ў Чырвоную Армію (у часе грамадзянскай вайны), то на настаўніцкую працу. Але ўсё ж магу лічыць сябе старым масквічом.

За такі доўгі час, як паўстагоддзя, пабачыў я ў Маскве шмат цікавага – і архітэктурных помнікаў, і людзей выдатных. Некаторых і на свеце ўжо няма. Пра свае сустрэчы з людзьмі я раскажу калі-небудзь адмыслова. А цяпер мне хочацца расказаць пра адзін маскоўскі дом, у якім па волі лёсу давялося бываць тройчы і падоўгу.

Гэты дом (вуліца Вароўскага, 52) належаў калісьці графам Салагубам. Для многіх ён вядомы, як “дом Растовых”. Запэўняюць, што нібыта Леў Талстой у сваім славутым рамане “Вайна і мір” апісваў менавіта гэты дом. Ці так яно, ці не так, але добра вядома, што ў часе працы над раманам Леў Мікалаевіч бываў тут не аднойчы, бо гэты дом адзін з нешматлікіх, які не згарэў у 1812 г. Я, зразумела, не буду разбіраць тут гісторыю дома з дарэвалюцыйнага часу. Нагадаю толькі цікавыя моманты з паслярэвалюцыйнага перыяду.

Калі з Ленінграду ў Маскву пераехаў быў Савецкі ўрад, у гэтым доме размясціўся Беларускі нацыянальны камісарыят (“Белнацком”). Тут жа была і рэдакцыя першай беларускай савецкай газеты “Дзянніца”. У гэтым доме рыхтаваліся першыя беларускія савецкія кнігі. Тут жа працавалі тыя выдатныя дзеячы, якія ў 1919 годзе абвясцілі ў Мінску ўтварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (А.Чарвякоў, С.Бурбіс, З.Жылуновіч і шмат іншых).

У 1918 годзе, кончыўшы настаўніцкую семінарыю, я прыйшоў у гэты камісарыят з просьбай, каб мяне паслалі настаўнікам на Беларусь. Адзін з тых дзеячоў сказаў мне, што “у даны момант гэта немагчыма. Беларусь занята ворагам. Заходзьце крыху пачакаўшы”... У восень гэтага ж году я паехаў настаўнічаць на Тульшчыну, а адтуль пайшоў у Чырвоную армію.

Дэмабілізаваўшыся ў жніўні 1921 г., я дачуўся, што ў Маскве адкрываецца літаратурна-мастацкі інстытут імя В.Я.Брусава і што Валеры Якаўлевіч будзе рэктарам і прафесарам гэтага інстытуту. Я паслаў дакументы, а ў прызначаны дзень прыйшоў і сам на калоквіум, на уступныя экзамены. Калі гляннуў – ды гэта ж дом – мой стары знаёмы! Я быў тут у 1918 г., калі ў ім размяшчаўся Белнацком… Нейк аж дзіўна было мне заходзіць у яго: тая ж самая музейная мэбля, скульптуры, нават "мядзведзь" перад гардэробным пакоем, але і ўсё інакшае: поўна юнакоў і юначак, якія прыйшлі сюды вывучаць таямніцы літаратурнай творчасці. Мяне прынялі і займаўся я тут бадай чатыры гады.

Прайшоў яшчэ вялікі адрэзак часу. Я выязджаў з Масквы на Далёкі Усход, у Сібір. Аб'ехаў, як кажуць, "круг свету". За гэты час Брусаўскі інстытут ліквідаваўся. Замест яго і ў іншым будынку заснаваўся літаратурны інстытут імя М.Горкага.

Калі я ў 1958 годзе прыехаў у Маскву, мне трэба было зайсці ў Саюз Пісьменнікаў СССР. Узяў я адрас … вуліца Вароўскага, 52! Прыходжу – той самы будынак! А якія перамены! Вялікая зала, дзе калісьці была наша большая аўдыторыя, у якой чытаў лекцыі Валеры Якаўлевіч Брусаў, дзе чыталі свае першыя творы мае сябры студэнты, а пасля вядомыя пісьменнікі (Арцём Вясёлы, Сцяпан Злобін, Іван Кашкін, Барыс Песіс, Ізі Харык, Юры Бярозка, К.Якаўчык…), дзе, прыходзячы ў госці да нас, выступаў А.Луначарскі, Ул.Маякоўскі, С.Есенін, М.Асееў, Г.Шэнгелі… Гэтая аўдыторыя стала канферэнц-залам Саюзу Пісьменнікаў. Меншыя аўдыторыі – пакоі, у якіх чыталі лекцыі П.С.Коган, І.С.Рукавішнікаў, М.О.Гершэнзон, М.С.Грыгор'еў, сталі кабінетамі адказных супрацоўнікаў Саюзу пісьменнікаў…

Тройчы лёс прыводзіў мяне ў гэты будынак… Калі я бываю ў ім цяпер, як жывыя паўстаюць перад маімі вачыма, у маім уяўленні маладыя, жвавыя сябры студэнцкіх часоў і нашыя патрабавальныя настаўнікі. На яве ж бачу тут многіх выдатных і шырока вядомых сучасных пісьменнікаў, якія ў тыя гады рабілі свае першыя крокі…

Вось якім цікавым для мяне выдаўся гэты дом і як для беларуса і як для пісьменніка…

Снежань 1972 г.